уласных аргументаў ці набытых пры чытанні тэарэтычнай літаратуры, аналізе методыкі лепшых бібліяграфічных прадуктаў.

Задача канструявання магчымых варыянтаў абапіраецца на разнастайныя і даволі складаныя кагнітыўныя працэсы і механізмы. Трэба звязаць паміж сабой мноства фактараў і прыёмаў, вылічыць і экстрапаліраваць тэндэнцыі, уявіць вынікі прыняцця пэўных рашэнняў. Зразумела, такая дзейнасць пасільная не для кожнага студэнта. Маючы гэта на ўвазе, мы прапануем працаваць «тройкамі», таму што вынік мазгавой атакі траіх у сукупнасці дае больш эфектыўны рэальны вынік, які дазваляе прапанаваць шляхі задавальнення розных інфармацыйных запытаў і павысіць такім чынам надзейнасць структураванасці даведачна-бібліяграфічнага апарату па мастацкай літаратуры, літаратуразнаўстве і мастацтве.

У заключэнне адзначым, што выкарыстанне разнастайных метадаў у іх комплексе ў працэсе навучання дапамагаюць выпрацаваць у студэнтаў уважлівасць, дысцыпліну, стрыманасць, назіральнасць, цярплівасць, вытрымку, працавітасць, акуратнасць, сістэмнасць у рабоце, адказнасць, актыўнасць, самастойнасць, ініцыятыўнасць і іншыя якасці.

**А.А.Трусаў,** *дацэнт*

## АСАБЛІВАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА ПА ГІСТОРЫІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры дысцыпліна «Гісторыя матэрыяльнай культуры» вывучаецца студэнтамі, якія навучаюцца па спецыяльнасці «музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры», на другім курсе. Агульная колькасць гадзін – 96. Асноўныя формы заняткаў – лекцыі і семінары. Форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У працэсе вывучэння матэрыялу курса студэнты знаёмяцца з развіццём матэрыяльнай культуры чалавецтва пачынаючы ад каменнага веку да нашых дзён. Значная ўвага звяртаецца на ўзровень матэрыяльнай культуры ўсіх старажытных цывілізацый свету. Асобныя лекцыі і семінары прысвечаны цывілізацыі Візантыі, краін мусульманскага свету, народаў заходняй, паўднёвай і паўночнай Еўропы, перыядам раманскага стылю і еўрапейскай готыкі. Значнае месца адведзена характарыстыцы Адраджэння, барока і класіцызму.

Асобна разглядаюцца такія тэмы, як “Асноўныя прадукты харчавання. Ежа і напоі”, “Гарады як феномен цывілізацыі”, “Тэхнічныя рэвалюцыі і транспарт”, “Медыцына і ахова здароўя ў XV–XVIII стст.”, “Адзенне і мода”, а таксама “Сучасная еўрапейская цывілізацыя”.

Прадугледжаны лекцыі на тэму “Кіеўская Русь (IX–XI стст.) і Украіна”, “Матэрыяльная культура Ноўгарада і Пскова”, “Маскоўская дзяржава і Расія”, “Беларускі горад у X–XVIII стст.”

Галоўная мэта курса – засваенне студэнтамі практычных ведаў па гісторыі рэчаў: месца іх узнікнення, тэхналогія вырабу, трансфармацыя іх зместу і сутнасці ў часе і пры пераходзе ад аднаго этнасу да іншага, асабліва ў перыяды вялікага перасялення народаў і вялікіх геаграфічных адкрыццяў.

Складанасць выкладання ў тым, што ў нашай краіне адсутнічаюць не толькі падручнікі, але нават і вучэбныя дапаможнікі па гэтым прадмеце. Справа ў тым, што ў былым Савецкім Саюзе ў апошнія 50 гадоў яго існавання такога прадмета не было. У 20-я гады XX ст. у Ленінградзе існаваў Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры, які праводзіў адпаведныя даследаванні і выпускаў неабходную літаратуру. Але ў часы сталінскай рэакцыі яго зачынілі, і толькі ў 1964 годзе ў Маскве быў адчынены Інстытут археалогіі АН СССР і яго філіял у Ленінградзе.

Так склалася, што гісторыя матэрыяльнай культуры была прадстаўлена як састаўная частка двух прадметаў: археалогіі і эт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

награфіі. У СССР існавалі падручнікі па археалогіі і этнаграфіі, але храналагічныя рамкі археалогіі заканчваліся XIII ст., а этнаграфія вывучала XIX—XX стст., прычым у асноўным праблемы вёскі. Такім чынам, перыяд у гісторыі матэрыяльнай культуры Еўропы і СССР з XIV ст. па XVIII ст. практычна зусім не вывучаўся, і трывалых сувязей у гісторыі рэчаў, звязаных з асноўнымі еўрапейскімі стылямі, студэнты прасачыць не маглі.

Таму пры распрацоўцы гэтага курса неабходна карыстацца не толькі падручнікамі па археалогіі і этнаграфіі, але і звесткамі розных еўрапейскіх даследаванняў у гэтай галіне, у першую чаргу працамі французскага даследчыка Фернана Бродэля "Структуры повседневности: возможное и невозможное" (М., 1986) і "Время мира" (М., 1992).

У апошнія гады некалькі цікавых выданняў выйшлі ў Беларусі. Гэта унікальная праца Адама Мальдзіса "Як жылі нашы продкі ў XVIII ст." (Мн., 2001) і Эдуарда Дубянецкага "Сучасная культура. Ад старажытнасці да нашых дзён" (Мн., 2001).

Некалькі гадоў таму для студэнтаў факультэта культуралогіі распрацаваны і чытаецца курс "Матэрыяльная культура Беларусі". Паводле вучэбнага плана на курс адводзіцца 64 гадзіны заняткаў. Паколькі студэнты факультэта культуралогіі не вывучаюць археалогіі, іх галоўная задача – прасачыць эвалюцыю гісторыі рэчаў на тэрыторыі нашай краіны ад каменнага веку да XVIII ст. Далейшы этап развіцця тэхнічнага прагрэсу ў XIX—XX стст. студэнты вывучаюць у курсе "Этнаграфія Беларусі".

Найбольш каштоўным матэрыялам для распрацоўкі гэтага курса з'яўляюцца энцыклапедычныя даведнікі "Архітэктура Беларусі", "Археалогія і нумізматыка Беларусі" і "Этнаграфія Беларусі", а таксама "Гісторыя беларускага мастацтва" ў шасці тамах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ